2. *Коротаева, Е. В.* Педагогика взаимодействий : учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / Е. В. Коротаева. – Екатеринбург : Урал. гос. пед. ун-т, 2000. – 146 с.

3. *Пометун, О. И.* Интерактивные технологии обучения: теория, практика, опыт / О. И. Пометун, Л. В. Пироженко. – М. : АПН, 2002. – 135 с.

4. *Рафикова, Р. С.* Интерактивные технологии обучения как средство развития творческих способностей студентов : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.01/ Р. С. Рафикова. – Казань, 2007. – 21 с.

5. *Ступина, С. Б.* Технологии интерактивного обучения в высшей школе : учеб.-метод. пособие / С. Б. Ступина. – Саратов : Наука. – 52 с.

**Л. К. Валасюк,**
*дацэнт кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*

# ПАДРЫХТОЎКА КІРАЎНІКОЎ АНСАМБЛЯ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ: СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

На сучасным этапе пераўтварэнні ў сферы музычнага мастацтва патрабуюць значнага якаснага паляпшэння прафесійнай падрыхтоўкі і ідэйна-эстэтычнага выхавання студэнтаў творчых УВА. Падрыхтоўка высокакваліфікаваных кіраўнікоў аркестра, ансамбля патрабуе шмат намаганняў для атрымання навыкаў прафесійнага валодання спецыяльным інструментам, аркестравым дырыжыраваннем, расшырэння мастацка-эстэтычным кругагляду, развіцця высокіх маральна-палітычнымі якасцей. У сучаснай сістэме адукацыі вырашальную ролю набываюць дысцыпліны, якія фарміруюць у студэнта веды, навыкі і ўменні, неабходныя для будучай творчай і педагагічнай дзейнасці.

Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры народна-інструментальнай творчасці з 1991 г. адкрыта спецыяльнасць «кіраўнік ансамбля», якая больш за дваццаць гадоў рыхтуе студэнтаў да практычнай дзейнасці. Работа кафедры ў такім напрамку патрабуе ад выкладчыкаў пастаянна ўдасканальваць сваё прафесійнае майстэрства і больш скрупулёзна рыхтаваць студэнтаў.

На кафедры існуюць ансамблі розных складаў і напрамкаў, дзе студэнты ўдасканальваюць навыкі выканання, авалодваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навыкамі ігры на некалькіх музычных інструментах. Дапамагае ў гэтым практычная дысцыпліна «Дадатковы народны інструмент». Работа змешаных саставаў павінна і далей ўдасканальвацца, але для больш якаснай падрыхтоўкі кіраўніка ансамбля лічым неабходным вучыць усіх студэнтаў і ў малых формах ансамбляў (дуэтах, трыа, квартэтах). Безумоўна, будучы кіраўнік павінен засвоіць усе формы ансамбляў.

Зараз ансамблевае выканальніцтва вельмі распаўсюджана. Гэта папулярная і даступная форма прафесійнага, аматарскага і самадзейнага музіцыравання. Яна адыгрывае важную ролю ў прапагандзе народных інструментаў, народнай і класічнай музыкі, у музычна-эстэтычным выхаванні. Ва ўсіх навучальных установах – ад з ДМШ і да ўстаноў вышэйшай адукацыі – існуюць вучэбныя ансамблі. У працэсе навучання найбольш часта выкарыстоўваюцца дуэты, трыа, квартэты, як аднародныя, так і змешаныя па саставу. Гэта прызнаныя, вызначаныя формы, якія маюць свае выканаўчыя традыцыі, заснаваныя на народна-інструментальнай творчасці. Акрамя традыцыйных саставаў ужываюцца квінтэты, секстэты, актэты і змешаныя ансамблі.

Існуюць розныя інструментальныя ансамблі. Яны адрозніваюцца па колькасным складзе, па рэпертуары, манеры выканання. Таму вельмі запатрабаваны нашы выпускнікі – высокакваліфікаваныя кіраўнікі ансамблей народных інструментаў. Многія з іх працуюць у калектывах са званнем «Народны», «Узорны» і г. д.

У працэсе падрыхтоўкі студэнта ў класе інструментальнага ансамбля неабходна вырашаць наступныя задачы:

– удасканаліць выканальніцкія навыкі ігры на інструментах;

– засвоіць навыкі ансамблевага выканальніцтва;

– развіць навыкі чытання нот з ліста ва ўмовах ансамблевай ігры;

– сфарміраваць рытмічную ўзгодненасць у працэсе выканання;

– вызначыць неабходныя дынамічныя суадносіны галасоў, авалодаць усімі асаблівасцямі дынамікі;

– засвоіць ансамблевы рэпертуар;

– вывучыць методыку работы з ансамблем;

– засвоіць навыкі выкарыстання розных сродкаў выканання.

Засваенне тэхнічных магчымасцей інструментаў, іх аплікатурных асаблівасцей, тэмбравага гучання дапамагае студэнтам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пры выкананні інструментовак, аранжыровак як для разнастайных ансамбляў, так і для аркестраў. Студэнты іграюць у ансамблі творы, інструментаваныя пад кіраўніцтвам выкладчыка па інструментоўцы. Вучэбны ансамбль – гэта творчая лабараторыя, дзе вучацца навыкам інструментоўкі. Іншы спосаб дасягнення большай эфектыўнасці і выніковасці вучэбнага працэсу можа быць такі: выкладчык – кіраўнік ансамбля – выкладае інструментоўку ў студэнтаў – удзельнікаў ансамбля. Гэта дае магчымасць больш якасна працаваць. Падбор рэпертуару з'яўляецца адным з вырашальных фактараў у стымуляванні мастацкага і тэхнічнага росту ансамблевага выканаўцы. Выкладчык павінен выкарыстоўваць усё багацце кампазітарскіх стыляў і жанраў, уключаць у вучэбны рэпертуар творы замежнай, рускай і беларускай класікі, а таксама лепшыя ўзоры сучаснай музыкі.

Роля выкладчыка і кіраўніка ансамбля ў падборы рэпертуару, вызначэнні складу ансамбля для выканання кожнага канкрэтнага твора значная. Для вырашэння гэтай задачы неабходна, каб студэнт меў навыкі ігры на розных народных інструментах і мог бы пры неабходнасці іграць на некалькіх. Калі студэнт будзе мець такую падрыхтоўку (валодаць 3–4 інструментамі), то гэта дазволіць рабіць разнастайны склад ансамбля, якасна, прафесійна рыхтаваць будучых кіраўнікоў ансамбляў. Дасягненню гэтай мэты дапамагае лекцыйна-практычная дысцыпліна «Методыка работы з аркестрам (ансамблем)». Лічым, абавязкова засвойваць розныя саставы ансамбляў. Кіраўнікам ансамбляў і дырыжорам аркестраў трэба набыць больш ведаў і навыкаў, неабходных у прафесійнай падрыхтоўцы. На наш погляд, увагу трэба акцэнтаваць на вытворчай практыцы. Неабходна перагледзець праходжанне студэнтамі вытворчай практыкі (без адрыву) на працягу двух гадоў і на базе творчых калектываў універсітэта. Студэнтам сёння неабходна не толькі даць моцную тэарэтычную падрыхтоўку, але і дазволіць практычна засвоіць спецыяльнасць. Гэта канцэртнае выкананне праграмы на кантрольных уроках, заліках, экзаменах; удзел творчых калектываў у канцэртным жыцці кафедры, факультэта, універсітэта, краіны; удзел студэнтаў у розных праектах, конкурсах, фестывалях. Патрэбен комплексны падыход да ўдасканалення вучэбнага працэсу, прафесійнай падрыхтоўкі кіраўніка ансамбля народных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усё вышэй сказанае дазваляе зрабіць вынік, што такая форма музычнага выканальніцтва, як ансамбль народных інструментаў, знаходзіцца ў пастаянным развіцці, удасканальванні.

1. *Имханицкий, М. И.* История исполнительства на русских народных инструментах: учеб. пособие для муз. вузов и училищ / М. И. Имханицкий. – М. : Изд-во РАМ им. Гнесиных, 2002. – 351 с.

2. Методыка і практыка самадзейнага аркестра народных інструментаў : вучэб-метад. дапаможнік / Мін. ін-т культуры ; склад. С. А. Анікееў. – Мінск : МІК, 1992. – 91 с.

3. Народно-инструментальное исполнительство Беларуси: вопросы теории, истории и методики : учеб. пособие / Белорус. гос. ин-т проблем культуры ; ред.-сост. Л. В. Шибаева. – Минск : БелГИПК, 2004. – 152 с.

**В. М. Валатковіч,**
*загадчык кафедры духавой музыкі,*
*дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА ДЫРЫЖЫРАВАННІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ (НАРОДНЫЯ, ДУХАВЫЯ І ЭСТРАДНЫЯ АРКЕСТРЫ)

Дырыжорскае мастацтва як найвышэйшы ўзровень музычнага выканальніцтва на сучасным этапе, як вызначыў І. Стакоўскі, засталося адной з самых туманных і няправільна ўспрымаемых галін музычнага выканальніцкага мастацтва. У методыцы выкладання дырыжыравання таксама ёсць шэраг супярэчнасцей, бо пры наяўнасці шэрага тэарэтычных распрацовак па тэхніцы дырыжыравання навучэнцу няпроста арыентавацца ў інфармацыі з прычыны або значнай складанасці, або недастатковай асэнсаванасці ролі тэхнікі дырыжыравання як сродку дасягнення пэўнай мастацкай задачы.

Аналіз дзейнасці кіраўнікоў народных, духавых і эстрадных аркестраў Рэспублікі Беларусь дазваляе зрабіць выснову аб тым, што агульны ўзровень тэхнікі дырыжыравання невысокі. Нягледзячы на як быццам бы плённую канцэртна-выканальніцкую дзейнасць, такая карціна назіраецца нават сярод кіраўнікоў, якія маюць адпаведную спецыяльную дырыжорскую падрыхтоўку сярэдняй або вышэйшага адукацыі.